**Т. Г. Казакевіч**

# СПРАШЧЭННЕ ГРУП ЗЫЧНЫХ ЯК АСАБЛІВАСЦЬ ФАНЕТЫКІ ВУСНАГА МАЎЛЕННЯ

Вуснае маўленне чалавека можа быць маналагічным і дыялагічным, падрыхтаваным і непадрыхтаваным, выразным і невыразным. Маналагічнае маўленне можа быць падрыхтаваным і непадрыхтаваным, выразным і невыразным; падрыхтаванае маўленне можа быць маналагічным і дыялагічным, часта з'яўляецца выразным. Спалучальнасць характарыстык вуснага маўлення залежыць ад умоў камунікацыі і ад таго, як моўца ставіцца да свайго вымаўлення.

З улікам гэтага – сітуацыі маўлення, мэты і прадмета выказвання, індывідуальных асаблівасцей моўцы ці суразмоўнікаў – адрозніваюць стылі вымаўлення. Поўны стыль вымаўлення – гэта выразнае вымаўленне, калі тэмп маўлення запаволены, моўца наўмысна выразна прамаўляе, бо ставіць перад сабой нейкія дадатковыя мэты: прыцягнуць увагу, падкрэсліць важнасць інфармацыі і інш. Нейтральны стыль вымаўлення – гэта маўленне ў сярэднім тэмпе, калі моўца знаходзіцца ў спакойным стане і імкнецца перадаць інфармацыю без дадатковых мэт. Няпоўны стыль вымаўлення вызначаецца недакладнасцю артыкуляцыі праз паскарэнне тэмпу вымаў-

лення, што абумоўлівае рэдукцыю, дэфармацыю моўных адзінак. Поўны стыль у звычайным, натуральным маўленні амаль не сустракаецца, магчымы пры вымаўленні толькі некаторых адрэзкаў. Для натуральнага маўлення характэрна спалучэнне стыляў вымаўлення, што абумоўлівае варыянтнасць у вымаўленні, а таксама інтэнсіўнасць працякання фанетычных працэсаў.

Спрашчэнне груп зычных з'яўляецца натуральным працэсам пры маўленні і абумоўлена характэрнай для беларусаў агульнай ненапружанасцю, расслабленасцю моўных органаў у час артыкуляцыі Спрашчэнне груп зычных, або дыярэза, – фанетычны працэс, пры якім са спалучэння зычных гукаў выпадаюць асобныя гукі, сярэднія або пачатковыя, што палягчае вымаўленне. Інтэнсіўнасць працякання працэсу абумоўлена стылем вымаўлення.

Незалежна ад стылю вымаўлення ў беларускай мове пад спрашчэнне падпадаюць спалучэнні з трох зычных гукаў, калі сярэдні са спалучэння – выбухны. Гэты гук знікае ў наступных спалучэннях, што адлюстроўваецца і на пісьме:

*здн → зн: праяз**н**ы (прае**зд**), выязны, позна;*

*згн → зн: браз**н**уць (бразгаць);*

*стн → сн: капу**сн**ы (капу**ст**а), посны, абласны, кантрасны;*

*скн → сн: блі**сн**уць (бля**ск**), трэснуць, пляснуць;*

*рдц → рц: сэ**рц**а (сар**д**эчны).*

Спрашчэнне ў гэтых выпадках з'яўляецца ўжо нормай літаратурнай мовы. Выпадзенне гукаў у гэтых пазіцыях абумоўлена знікненнем рэдукаваных. Пасля знікнення ўтварыліся цяжкія для вымаўлення спалучэнні зычных гукаў, вымаўленне якіх спрашчаецца за кошт выкідкі аднаго гука са спалучэння.

Пры паскораным тэмпе маўлення падобныя выпадзенні магчымыя ў наступных спалучэннях:

*стк → ск: артыстка ([артыска]), машыністка ([машын'іска]);*

*стц →сц: аб артыстцы [артысцы], аб нявестцы [н'ав'эсцы];*

*нтк → нк: студэнтка ([студэнка]), магістрантка ([маг'істранка]);*

*зд[т]к →з[с]к: паездка ([пайэска]);*

*гск [кск]→ ск: магдэбургскі ([магдэбурск'і], пецярбургскі ([п'ец'арбурск'і].*

Пазіцыя канца слова – пазіцыя, дзе ў беларускай мове можна назіраць спрашчэнне групы зычных са знікненнем гука. Напрыклад, у спалучэнні зычных *[дт]* у канцы іншамоўнага слова, што адлюстроўваецца на пісьме і з'яўляецца нормай літаратурнай мовы: *Краншта**т**, Шмі**т**, Рэмбран**т**.*

У назоўніках жаночага роду, якія заканчваюцца на *-сць* пры хуткім і сярэднім тэмпе маўлення, назіраем працэс спрашчэння ў канцы слова: *радасць [радас'] дзіцяці, творчасць [творчас'] мастакоў, маладосць [маладос'] прайшла.*

Пры хуткім тэмпе маем страты гукаў *[г'], [ц'] у* спалучэннях зычных у лічэбніках: *шэсць [шэс'] кніг, семдзесят [с'эмс'ат'], восемдзесят [вос'эмс'ат'], пяцьдзясят [п'аг'ас'ат]*, у форме інфінітыва: *у нас ёсць [йос'] справы, хачу сесці [сэс'] там, трэбы класці [клас'] туды.*

Пры хуткім маўленні ў выніку працэсу спрашчэння ствараюцца такія гукавыя камбінацыі, якія часта адсутнічаюць пры поўным стылі вымаўлення. Моўца імкнецца зменшыць свае намаганні пры артыкуляцыі, скарачае словы, але пры гэтым ён застаецца зацікаўленым у тым, каб яго зразумелі.